відаў. Пашыраны ў Паўн. паўшар'і (акрамя Аляскі і Канады). На Беларусі як заносныя, інтрадукаваныя і здзічэлыя трапляюцца К. канарскі (Ph. canariensis) і малы (Ph. minor) каля дарог, жылля і інш.

Адна-, радзей шматгадовыя травяністыя расліны са шматлікімі прамастойнымі ці каленчата-ўзыходнымі сцёбламі (саломінамі) выш. да 120 см. Лісце лінейнае або лінейна-ланцэтнае з гладкімі ці шурпатымі пазухамі. Кветкі (па 3) у яйцападобных каласках, сабраных у густое мяцёлчатае суквецце. Плод — зярняўка. Кармавая (канарэечнае семя), харч., тэхн., алейная, лек. і дэкар. расліна; некат. віды — пустазелле. *Г.У.Вынаеў.*

**КАНАРЭ́ЙКА** (Serinus canaria), *дэкаратыўная птушка* сям. ўюрковых (Fringillidae), атр. вераб'інападобных (Passeriformes). У дзікім стане пашырана на Канарскіх а-вах (адсюль назва). З'яўляецца родапачынальніцай пакаёвай К. У Еўропу завезена ў канцы 15 ст. Выведзена шмат парод, якія адрозніваюцца спевам і экстэр'ерам.

Даўж. 12—14 см. Колер апярэння ў дзікіх К. зверху шэра-зялёны, знізу жоўта-зялёны, у самцоў больш яркі. Гл. таксама *Уюрок канарэечны.*

**КАНАСАМЕ́НТ** (франц. connaissement), дакумент аб умовах дагавору перавозкі грузу марскім шляхам; распіска, якая выдаецца капітанам судна або агентам марскога трансп. прадпрыемства (параходства) грузаадпраўшчыку з пацвярджэннем прыняцця грузу да перавозкі і абавязацельствам дастаўкі яго ў порт прызначэння і выдачы адрасату (грузаатрымальніку). З'яўляецца *каштоўнай паперай*. Трымальнік гэтага дакумента атрымлівае права распараджацца грузам. Адрозніваюць К.: л і н е й н ы у якім выкладзена воля адпраўшчыка на заключэнне дагавору перавозкі грузу; ч а р т а р н ы — пагадненне аб найме судна для выканання рэйса або на вызначаны час; б е р а г а в ы пацвярджае прыём грузу ад адпраўшчыка на беразе (на складах перавозчыка); б а р т а в ы выдаецца, калі тавар пагружаны на судна. Паняцце К., яго неабходныя рэквізіты і ўмовы складання вызначаны ў кодэксе гандл. мараплавання. Адсутнасць рэквізітаў пазбаўляе К. функцый таваараразмеркавальнага дакумента, і ён не з'яўляецца каштоўнай паперай.
*У.Р.Залатагораў.*

**КАНА́Т**, гнуткі выраб з стальнога дроту або нітак пражы (каболак) раслiннага, мінер. ці сінт. паходжання. Падзяляюцца на кручаныя (вітыя), някручаныя і плеценыя.

С т а л ь н ы я К. робяць з высокатрывалага дроту дыяметрам 0,3—4 мм. Кручаныя атрымліваюць адзінарным (спіральныя К.), двайным (тросавыя) і трайным (кабельтавыя) звіваннем. Для эластычнасці ў сярэдзіну К. ўплятаюць валакністы або метал. асяродак. Звіванне бывае аднабаковае (дрот у пасмах і самі пасмы скручаны ў адзін бок) і крыжовае (у розныя бакі). Някручаныя К. складаюцца з шчыльна ўкладзеных груп стальнога дроту або спіральных К., змацаваных спіральнай абмоткай ці заціскачкамі. Плеценыя К. робяць з цотнага ліку (звычайна 4) пасмаў, скручаных у розных напрамках. Н е м е т а л і ч н ы я К. звіваюць з доўгіх натуральных (пяньковых, бавоўняных, джутавых, сізалевых, азбеставых) або сінтэтычных (капронавых, нейлонавых, поліпрапіленавых і інш.) валокнаў (з кароткіх пяньковых і бавоўняных валокнаў уюць вяроўкі, шпагат і да т.п.). Каната-вяровачныя вырабы з валакністых матэрыялаў і стальнога дроту наз. т р о с а м і (пра іх злучэнне гл. ў арт. *Вузлы марскія*). К. выкарыстоўваюць на транспарце (на *канатных дарогах*, *фунікулёрах*, у суднавым такелажы і інш.), у буд-ве (у *вісячых канструкцыях*, грузападымальных машынах), горнай (у шахтавых пад'ёмніках, каменярэзных машынах), рыбалоўнай (у тралах, невадах), лясной і інш. галінах прам-сці.

**КАНАТА́ЦЫЯ** [позналац. connotatio ад лац. con (cum) разам + noto адзначаю, абазначаю], дадатковыя семантычныя або стылістычныя адценні, якія накладваюцца на асноўнае значэнне моўнай адзінкі і служаць для стварэння экспрэсіўна-эмацыянальнай афарбоўкі выказвання (надання тону ўрачыстасці або зніжанасці, ласкі або іроніі і інш.). Найб. выразна выяўляецца пры супастаўленні ацэначных слоў і выразаў з адпаведнымі ім стылістычна нейтральнымі сінонімамі («кляча» — худы заезджаны конь; «пражэкт» — неажыццявімы праект). У розных моўных кантэкстах адно і тое слова можа выяўляць розную К. Дадатковыя семантычныя і стылістычныя адценні могуць надавацца словам з дапамогай некат. афіксаў («дом—домік», «даміна — дамішча») або непасрэдна ўключацца ў лексічнае значэнне слова («абязлічка», «вярзці», «задзіра» і інш.).

*Літ.*: Т у р о ў с к а я Ф.А. Канататыўныя значэнні «нейтральнай» лексікі // Бел. лінгвістыка. 1982. Вып. 21; Т е л и я В.Н. Коннотативный аспект семантики номинативных единиц. М., 1986.

**КАНА́ТНАЯ ДАРО́ГА**, збудаванне для транспартавання грузаў і пасажыраў у падвесных ваганетках (цялежках, крэслах, кабінах), якія рухаюцца па стальных канатах, нацягнутых паміж апорамі. Бываюць грузавыя, пасажырскія і камбінаваныя, 2- і 1-канатныя, з кальцавым і маятнікавым рухам ваганетак. Будуюць у горных, перасечаных і інш. цяжкадаступных мясцовасцях, гарадах, перагружаных наземным транспартам.

Грузавыя К.д. звычайна 2-канатныя з кальцавым рухам ваганетак. Вугал пад'ёму да 30° і больш, скорасць да 3,3 м/с і больш. Выкарыстоўваюцца ў гарнаруднай, металургічнай, хім. і інш. галінах прам-сці. Пасажырскія К.д. бываюць 2-канатныя з маятнікавым і кальцавым рухам вагонаў (на 12—100 або 4 чал.) і 1-канатныя (звычайна кальцавыя) з жорстка замацаванымі 1- або 2-меснымі сядзеннямі. Вышыня пад'ёму да 3 км, скорасць руху 1,5—11 м/с. У горнай мясцовасці пашыраны 1-канатныя буксіровачныя К.д. для гарналыжнікаў. Бываюць і наземныя К.д. для перамяшчэння ваганетак і інш. трансп. сродкаў па вузкакалейных рэйкавых пуцях, пракладзеных па крутым пад'ёме. Выкарыстоўваюцца ў кар'ерах, на прамысл. прадпрыемствах і інш. *І.І.Леановіч.*

**КАНА́ТНІК**, кветкавая расліна, тое, што *абутылон.*

**КАНАЎНІ́ЦЫН** Пётр Пятровіч (9.10.1764—9.9.1822), рускі ваенны дзеяч. Ген. ад інфантэрыі (1817), граф (1819). Удзельнік руска-шведскіх войнаў 1788—90 і 1808—09. У час ваен. дзеянняў супраць Рэчы Паспалітай 1792—94 камандаваў мушкецёрскім палком. На пач. вайны 1812 камандаваў 3-й пях. дывізіяй у 3-м корпусе ген. М.А.Тучкова, у баях каля в. Астроўна




Схема падвеснай канатнай дарогі: 1 — механізм нацяжэння канатаў; 2 — вагоны; 3 — накіравальная рэйка для зняцця вагонаў з канатаў; 4 — лябёдка; 5 — нерухомы канат, па якім коцяцца вагонныя колы; 6 — рухомы канат, які цягне вагоны паміж станцыямі.